# 9 мая — 60 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне

www.gazeta.bsu.by

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

3 мая 2005 года, № 10 (1918)

## СА СВЯТАМ ПЕРАМОГІ!

### Са святам Вялікай Перамогі!

Мільёны жыццяў аддадзена за яе, вялізарным гераізмам і мужнасцю людзей яна была здабыта!

Мы схіляем галовы перад тымі, хто загінуў у барацьбе з фашызмам, мы гаворым словы ўдзячнасці тым ветэранам і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, якія разам з намі сустракаюць 60-ю Вясну Перамогі.

З кожным годам маштаб трагедыі, якую перажылі нашы дзяды і бацькі, веліч іх славы не памяншаецца. Кожны год прыносіць новыя сведчанні подзвігу, які быў здзейснены нашым народам, народамі іншых краін у змаганні з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта таксама ўнесены ў Спіс герояў Вялікай Айчыннай вайны. Вечная ім памяць і пашана!

Мы святкуем Перамогу і радуемся мірнаму спакойнаму жыццю. Хай будзе так заўсёды! Шчасця і здароўя ветэранам, іх дзецям і ўнукам! Са святам!





Рэктар БДУ прафесар Васіль СТРАЖАЎ



Падчас святкавання 60-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Ліпень 2004 г.

## ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

### СВЯТА ПЕРАМОГІ Ў БДУ

Святочнае ўшанаванне ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны адбудзецца 6 мая ў 10.00 ва ўнутраным дворыку БДУ. У рамках праграмы: цырымонія ўскладання кветак і гірляндаў да памятнага знака, урачысты марш курсантаў ваеннага факультэта БДУ і палявая кухня.

Запрашаем!

## ПАДЗЕІ

### "АЛЕЯ ГЕРОЯЎ" У "БРЫГАНЦІНЕ"

"Алея герояў" з'явілася 23 красавіка ў САК "Брыганціна". Дванаццаць маладых дрэўцаў былі пасаджаны ў гонар дванаццаці супрацоўнікаў БДУ, узнагароджаных званнем Героя Савецкага Саюза. Акцыя была прысвечана 60-годдзю Перамогі.

Удзел у акцыі прынялі прадстаўнікі БДУ, БНТУ, БДГУ, БДТУ, БДЭУ і БДУІР. Алея павінна стаць жывым напамінам пра тых, хто змагаўся за Радзіму падчас Вялікай Айчыннай вайны. Трэба спадзявацца, што дрэвы прыжывуцца і яшчэ шмат гадоў будуць нагадваць пра тую пашану, з якой нашчадкі ставяцца да ветэранаў.

**Аляксандр САЛАМАХІН**

## АКЦЫІ

### УСПАМІН ПРА ЗАГІНУЎШЫХ

*Напярэдадні святкавання 60-годдзя Перамогі студэнты і супрацоўнікі БДУ правялі ўпарадкаванне пахаванняў савецкіх салдат.*

Як паведамілі ва ўпраўленні выхаваўчай работы з моладдзю, студэнты гістарычнага і геаграфічнага факультэтаў наводзілі парадак на Вайсковых могілках, што знаходзяцца на вуліцы Казлова ў Мінску. Яны зграбалі лісце, падмяталі тэрыторыю: памяць і пашана патрэбны не толькі жывым, але і загінуўшым героям.

З 18 па 21 красавіка група студэнтаў гістарычнага факультэта і факультэта філасофіі і сацыяльных навук пад кіраўніцтвам прарэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У.В. Суворава займалася ўпарадкаваннем пахаванняў савецкіх салдат у г. Пултуску (Польшча). Разам з беларусамі ў акцыі ўдзельнічалі студэнты польскай Вышэйшай гуманітарнай школы імя Аляксандра Гейштара, а таксама Калінінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Акцыя стала магчымай дзякуючы дамоўленасці паміж рэктарамі БДУ і Вышэйшай гуманітарнай школы, якая была дасягнута ў студзені гэтага года. У Пултуску пахавана 17 тыс. савецкіх воінаў, якія загінулі пры вызваленні Польшчы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

**Аляксандр САЛАМАХІН**

## З ГІСТОРЫІ БДУ

# У ГАДЫ ВЯЛІКІХ ВЫПРАБАВАННЯЎ

У чэрвені 1941 г. БДУ рыхтаваўся адзначаць сваё 20-годдзе. Гэта свята павінна было адзначацца на самым высокім узроўні: спецыяльнае рашэнне пра святкаванне юбілею БДУ ўрад БССР прыняў яшчэ ў сакавіку. Універсітэт сустракаў свой юбілей значнымі поспехамі. За 20 год працы тут было падрыхтавана 5240 спецыялістаў для гаспадаркі краіны. Перад вайной ва ўніверсітэце было ўжо 6 факультэтаў і 33 кафедры. Педагагічную і навуковую працу вялі 17 прафесараў і 41 дацэнт, а агульная колькасць супрацоўнікаў складала больш за 500 чалавек. 60 выкладчыкаў былі выпускнікамі БДУ. На пачатак вайны ў аспірантуры ўніверсітэта навучаліся 60 чалавек. Толькі з 1937 па 1941 год 39 выпускнікоў БДУ абаранілі кандыдацкія дысертацыі. Да юбілею была прымеркавана абарона яшчэ пяці кандыдацкіх дысертацый. Абсталяванне ўніверсітэта, па сведчанні замежных навукоўцаў, якія наведалі БДУ ў 1940 г., было на ўзроўні найлепшых замежных універсітэтаў.

На 24—28 чэрвеня было прызначана святкаванне: юбілейная навуковая сесія і ўрачыстае пасяджэнне. Аднак гэтаму не наканавана было спраўдзіцца — пачалася вайна. У першыя дні універсітэт яшчэ працаваў — пісьменнік І.Ф.Кудраўцаў, у той час студэнт БДУ, успамінаў, як падчас экзамена па гісторыі пачалася бамбёжка і з вокнаў біялагічнага корпуса быў бачны, як на далоні, ахоплены агнём будынак чыгуначнага вакзала. Але ўжо 28 чэрвеня Мінск быў акупаваны.

## БДУ на франтах вайны

Ужо ў першыя дні вайны больш за 450 студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ пайшлі на фронт. Многія апынуліся ў партызанскіх атрадах і антыфашысцкім падполлі. Па далёка няпоўных падліках, у абароне Масквы ўдзельнічалі 47 студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ, у абароне Ленінграда — 36, Сталінграда — 28, Каўказа — 10, у штурме Берліна — 39, Кёнігсберга — 39, у вызваленні Варшавы — 34 і г.д. Немагчыма пералічыць усе значныя бітвы той вайны, у якіх прымалі ўдзел супрацоўнікі і гадаванцы БДУ. Тым больш, што адбываліся яны не толькі на фронце, але і ў тыле ворага. Сярод герояў — знакамітыя беларускія партызаны і падпольшчыкі. У мінскім падполлі, напрыклад, у шэрагу іншых вызначыўся сакратар камсамольскай арганізацыі хімічнага факультэта Георгій Фалевіч. Далёка не ўсе вярнуліся з той вайны. Многія (як, напрыклад, выпускнік педагагічнага факультэта Л.Сушчынскі) склалі свае галовы пры вызваленні ад захопнікаў роднай Беларусі. Па сведчанні ветэрана вайны, выпускніка факультэта народнай гаспадаркі і права А.Л.Каленіка, з усіх яго аднакурснікаў — удзельнікаў вайны да Перамогі дайшлі толькі чацвёра. У гонар загінуўшых у двары ўніверсітэта ўстаноўлены помнік.

## Акупацыя

У першыя дні акупацыі ў будынках універсітэта размясціліся вайсковыя часці. На той час у лабараторыях і кабінетах заставаліся значныя каштоўнасці: спектрографы, ультрамікраскопы, фотаапараты, абсталяванне газавага завода, тры музеі, багатая бібліятэка і многае іншае. Пачалося паслядоўнае рабаванне і знішчэнне маёмасці нацыянальнага беларускага ўніверсітэта.

Пасля сыходу армейскіх часцей з універсітэта на пачатку жніўня 1941 г. адкрылася жудасная карціна разбурэння: усё было загаджана, падрана, пабіта. Каштоўныя апараты і прыборы зніклі ці былі паламаныя. Падлога была пакрытая друзачкамі шкла, парванымі кнігамі і дакументамі, оптыка знікла. У механічных майстэрнях ад станкоў засталіся толькі станіны. Дарэчы, такі ж пагром чараваў і ў Акадэміі навук, і ў Політэхнічным інстытуце...

Пасля ўладкавання нямецкай грамадзянскай адміністрацыі пачалася другая хваля рабавання. Пачалі ўскрываць незагаральныя шафы. Супрацоўнікам БДУ, якія чысцілі будынкі ад пакінутага вайскоўцамі бруду, забаранілі з'яўляцца ва ўніверсітэце на працягу тыдня. За гэты час вывезлі маёмасць на некалькіх грузавіках.

Кіраўнік гебітскамісарыята доктар Кайзер выбраў рэзідэнцыяй біялагічны корпус. Ацалелую мэблю: шафы, крэслы, сталы і нават аконныя шыбы — з нямецкай акуратнасцю зносілі туды і размяркоўвалі.

З бібліятэкі бралі любыя кнігі. Праз некалькі месяцаў яна апынулася ў калідоры, кнігі сталі знікаць. Бібліятэка завочнага корпуса была выкінутая на вуліцу. Супрацоўнікі БДУ пад кіраўніцтвам А.В. Вязовіча сабралі большую частку кніг і разам з заалагічным музеем перавезлі ў дом па вул. Віцебскай. Ад 1942 г. найбольш цэнныя кнігі пад наглядам доктара Альбера Рыхеля, дырэктара бібліятэкі Кёнігсбергскага ўніверсітэта вывозіліся ў Кёнігсберг, Прагу, Берлін.

Хімічны корпус быў "памыйніцай" універсітэцкага гарадка: туды зносілі "непатрэбнае" абсталяванне, рэшткі мэблі, хімікаты і інш. На пачатку снежня рэшткі мэблі вывезлі на абутковую фабрыку: відаць, там іх выкарыстали як паліва. У 1942 г. корпус перадалі пад шпіталь. Апаратуру перавезлі ў Політэхнічны інстытут. У 1943 г. будынак інстытута перадалі шпіталю, а маёмасць: мінералагічны музей, бібліятэка, рэшта хімічнага абсталявання — пераехала ў дом па вул. Віцебскай. Усё рабілася сіламі супрацоўнікаў універсітэта і 8—10 мінскіх настаўнікаў: яны былі і грузчыкамі, і возчыкамі, і вартаўнікамі. Маёмасць ахоўвалі на працягу 1943—1944 гг., але ў апошнія дні акупацыі будынак загарэўся, і загінула пераважная большасць усяго.



З выкладчыкаў, якія вымушаны былі застацца ў Мінску падчас акупацыі, знік без вестак акадэмік С.Я. Вальфсон, у гета загінулі М.Я. Пелеп, І.С. Рыўкінд. Былі расстраляны Я.М. Зубковіч, А.В. Вязовіч.

## БДУ пад Масквой

У студзені 1943 г. СНК БССР звярнуўся да СНК СССР з хадайніцтвам аднавіць БДУ ўжо падчас вайны. Гэта дазваляла сканцэнтраваць вакол універсітэта асноўную групу навукоўцаў і выкладчыкаў як БДУ, так і іншых ВНУ Беларусі, каб потым лягчэй было аднавіць сетку ВНУ.

У студзені 1943 г. даваеннага рэктара Парфена Пятровіча Савіцкага адклікалі з эвакуацыі ў Маскву і 16 лютага прызначылі рэктарам БДУ. 15 мая 1943 г. СНК СССР прыняў пастанову "Аб аднаўленні работы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта". Месцам працы была абрана станцыя Сходня Хімкінскага раёна Кастрычніцкай чыгункі пад Масквой (сёння ў межах горада). Былі абазначаны функцыі ўніверсітэта: падрыхтоўка кваліфікаваных спецыялістаў для працы ў розных галінах народнай гаспадаркі і культуры, вырашэння найважнейшых задачаў сацыялістычнага будаўніцтва і абароны краіны.

Тут і выявіўся арганізатарскі талент П.П. Савіцкага. У эвакуацыі ён збіраў звесткі пра выкладчыкаў БДУ. Усё лета 1943 г. ішло рассяленне выкладчыкаў і студэнтаў у дачных дамах і пасёлку. Адміністрацыя размясцілася ў будынку школы. Даводзілася вырашаць тысячы праблемаў, і галоўнай была арганізацыя харчавання. Напярэдадні восені Савіцкі наладзіў збор ягад, грыбоў, нарыхтоўку дроваў. Тыя, хто жыў у Сходні, назаўжды запомнілі плакат у сталоўцы: "Студэнты БДУ, у паход па крапіву!" Узімку ўзнікла паліўная праблема: універсітэту далі дзялку лесу, і студэнты з выкладчыкамі адпраўляліся на лесапавал. Абавязковае для ўсіх трохразовае харчаванне давала магчымасць падтрымліваць сілы.

Улетку 1943 г. адбыўся набор студэнтаў на гістарычны, філалагічны, фізіка-матэматычны, хімічны, біялагічны, геаграфічны факультэты. Стваралася бібліятэка, для якой ВНУ Масквы перадалі каля 18.000 кніг. У лістападзе 1943 г. універсітэту перадалі ў часовае карыстанне маёмасць (фізічныя і біялагічныя прылады) Віцебскага педінстытута.

Заняткі пачаліся 11 лістапада 1943 г. Спярша ў аднаўленым БДУ вучыліся 289 студэнтаў, але ў снежні было ўжо каля 500 чалавек. Заняткі вялі 40 выкладчыкаў. Асноўную частку калектыву склалі даваенныя навуковыя работнікі БДУ: прафесары Ц.М. Годнеў, У.М. Перцаў, М.М. Нікольскі, дацэнты М.Р. Ларчанка, А.М. Нахімоўская, Л.М. Шнеерсон і інш. Працавалі ў БДУ і маскоўскія навукоўцы Б.А. Рыбакоў, К.Б. Сіўкоў, А.М. Панкратава і інш. Зімовую сесію на "выдатна" здалі толькі 15 % студэнтаў, астатнія на "добра" (21 %), і "нездавальняюча" (39 %).

У жніўні 1944 г. пасля вызвалення Мінска ад нямецкіх захопнікаў скончыўся сходненскі перыяд дзейнасці БДУ. Першыя 26 студэнтаў на чале з рэктарам прыбылі ў Мінск 11 жніўня. Універсітэцкі гарадок быў у вартым жалю выглядзе: карпусы згарэлі ў ліпені 1944 г. Нармальна выглядаў толькі фізіка-матэматычны корпус. Усё давялося пачынаць практычна з нуля.

## Вяртанне ў Мінск

Разбурэнні будынкаў склалі: галоўны корпус — 67 %, хімічны — 68,1 %, біялагічны — 67,1 %, анатамічны — 67,1 %, газавы завод і падземная газавая сетка — 43,2 %, дом прафесараў на вул. Кірава — 100%, інтэрнат на вул. Маскоўскай — 60 %, інтэрнаты на вул. Студэнцкай — 100 %. Агульная сума ўрону склала больш за 36 мільёнаў рублёў.

Даводзілася думаць, як удыхнуць жыццё ў абгарэлыя каробкі будынкаў. У верасні прыбыў эшалон з супрацоўнікамі і студэнтамі БДУ. Інтэрнат для студэнтаў і выкладчыкаў зрабілі ў хімкорпусе. Дапамагалі баракі, зробленыя немцамі для гаспадарчых патрэб у двары ўніверсітэцкага гарадка. Фізмат заняў свой корпус, які цудам не пацярпеў. Хімікі і біёлагі займаліся ў будынку на вул. Віцебскай, 9, астатнія — у школе № 2. Заняткі ішлі ў 2—3 змены. Узімку 1944—1945 гг. у аўдыторыях стаяў такі холад, што замярзалі чарніліцы. Студэнты цішком ламалі сталы і лавы, каб здабыць хаця б крыху паліва для печак.

Але ўніверсітэт працягваў жыць. У снежні 1944 г. былі створаны завочны факультэт і факультэт журналістыкі. У лістападзе 1944 г. на 7 факультэтах БДУ навучаліся больш за 700 студэнтаў.

Універсітэцкі калектыў прыняў удзел у аднаўленні Мінска. У 1944 г. сесія Мінгарсавета прыняла рашэнне пра абавязковую працу кожнага студэнта па 15 гадзін штомесяц на аднаўленні горада, а студэнты ўзялі на сябе абавязак адпрацаваць па 20 гадзінаў.

Важнай падзеяй, якая засведчыла, што БДУ насамрэч адраджаецца, стала навуковая сесія 19—23 мая 1945 г. Яна прысвячалася аднаўленню працы ўніверсітэта і яго ўдзелу ў аднаўленні народнай гаспадаркі і культуры Беларусі. Працавалі гісторыка-філалагічная, біёлага-геаграфічная, фізіка-матэматычная і хімічная секцыі. У жніўні 1945 г. адбыўся першы паваенны набор студэнтаў — 420 чалавек.

**А.Г. ЗЕЛЬСКІ,**
**кандыдат гістарычных навук**



НАВУКОВЫ ІНТАРЭС

## ТЭСТ НА ГІСТОРЫЮ

У гэтым навучальным годзе студэнтам пачалі чытаць спецкурс "Вялікая Айчынная вайна". Каб вызначыцца з тэматыкай заняткаў па спецкурсе і прасачыць, як студэнты ўспрымаюць феномен вайны, прафесар кафедры філасофіі культуры ФФСН Інеса Львоўна Зелянкова правяла сацыялагічнае міні-даследаванне. Удзел у ім прынялі студэнты-другакурснікі з аддзялення інфармацыі і камунікацыі факультэта філасофіі і сацыяльных навук. Вынікі тэсціравання былі выкарыстаны выкладчыкамі кафедры пры чытанні спецкурса "Вялікая Айчынная вайна савецкага народа".

Праводзілася даследаванне ў форме тэста з трох блокаў, анаінімна і па некалькіх напрамках. Характэрна, што адказы ў ім былі запланаваны разгорнутыя, з абгрунтаваннем уласнай пазіцыі.

Першы блок тэста прапаноўваў вызначыць значнасць Вялікай Айчыннай вайны. З адказаў на пытанні была зроблена высноза, што гэтая вайна "адыграла вялікую ролю ў гісторыі чалавецтва". Студэнты акрэслілі не толькі негатыўныя бакі вайны, але і станоўчыя: выкрыццё вайны як сродку вырашэння палітычных задач, знішчэнне фашызму, з'ядненне людзей, якія адстойвалі незалежнасць сваёй краіны, змена маральных арыентацый людзей. Інеса Львоўна адзначае, што 80 % студэнтаў лічаць, што правільная ацэнка і асэнсаванне ўрокаў Вялікай Айчыннай вайны маюць важнае значэнне для цяперашняга часу і для будучыні. На погляд студэнтаў, вайна "паказала, наколькі страшнае ўздзеянне таталітарнага рэжыму і чалавеканенавісніцкіх ідэй", "падкрэсліла крохкасць чалавечага жыцця, страшныя наступствы выкарыстання чалавека ў якасці сродку", "выявіла жудасную карціну болю, пакутаў, смерці, руйнавання чалавечых лёсаў" і г.д.

У другім блоку даследавання студэнтам прапанавалі размежаваць паняцці "патрыятызм" і "нацыяналізм". "Студэнты вельмі дакладна размежавалі гэтыя паняцці. Я думала, што адносіны да нацыяналізму будуць больш захопленымі, з неразуменнем маральных аспектаў. Але выявілася, што студэнты ясна ўяўляюць сабе маральныя наступствы як патрыятызму, так і нацыяналізму", — кажа Інеса Львоўна. Студэнты вызначылі патрыятызм як неадменную якасць кожнага грамадзяніна, як удзячнасць сваёй краіне, як маральны закон. Нацыяналізм жа яны разглядаюць як навязлівую ідэю, якая вядзе да этнацэнтрызму, войнаў і тэрарызму.

Трэці блок быў скіраваны на асабістае ўспрыманне Вялікай Айчыннай вайны студэнтамі і вызначаў гатоўнасць абараняць радзіму са зброяй у руках. Прааналізаваўшы адказы на пытанні гэтага блока, Інеса Львоўна зрабіла выснову, што студэнты лічаць абарону радзімы праявай патрыятызму, выяўляюць гатоўнасць абараняць сваю краіну, але не любымі сродкамі і не пры любых акалічнасцях. Студэнты ганарацца нашай радзімай, якая змагла выстаяць і перамагчы ў жудасных умовах вайны.

Вынікі правядзення такіх тэстаў на іншых факультэтах паказалі, што асаблівасці ўспрымання феномену вайны, адзначаныя І.Л. Зелянковай, тыповыя для ўсіх студэнтаў БДУ незалежна ад факультэта і курса навучання.

**Юлія ПАПОВА**

КОНКУРСЫ

# СТУДЭНТЫ ДАСЛЕДУЮЦЬ ВАЙНУ

## Факты, лічбы, меркаванні...

*У III тур Рэспубліканскага конкурсу творчых работ навучэнцаў і студэнтаў "Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці беларускага народа" выйшлі каля 100 студэнтаў БДУ. Сёння "Беларускі універсітэт" прапануе вам пазнаёміцца з некаторымі ўдзельнікамі, чые работы прадстаўлены на III тур конкурсу.*

### Сабатаж пад акупацыяй



**Студэнтка I курса эканамічнага факультэта Юлія ШАБРОВА** прадставіла на конкурс работу на тэму "Роля барацьбы беларускага народа ў зрыве эканамічнай палітыкі акупантаў". "Існуе меркаванне, што нямецкае кіраўніцтва ў свой час абрала няправільную эканамічную палітыку на тэрыторыі СССР, — раскажае Юля, — а я ў сваёй рабоце сцвярджаю, што тыя ж самыя меры маглі б быць эфектыўнымі ў прымяненні да іншага народа. Справа тут у нашым менталітэце, ва ўменні актывізаваць свае сілы і дасягнуць патрэбнай мэты. У нашых партызанскіх зонах былі млыны, пякарні, шавецкія і скураныя майстэрні, нават аэрадромы! У Беларусі немцы разлічвалі ў першую чаргу на тарфяныя запасы, але дзякуючы намаганням нашага народа нямецкія прадпрыемствы засталіся на галодным энергетычным пайку. Я аналізавала дзейнасць партызанаў і тое, як удала праводзіўся сабатаж".

**— У чым, на твой погляд, арыгінальнасць гэтага даследавання?**

— Мабыць, у тым, што ў ім даецца не сухое выкладанне фактаў, а цікавыя меркаванні накотт заслуг нашага народа. У эканамічнай сферы простыя беларусы адыгралі вырашальную ролю.

### Эканоміка вайны



**Ігар ГАЛЬЧУК, студэнт II курса эканамічнага факультэта,** распрацоўваў тэму "Эканамічныя наступствы Вялікай Айчыннай вайны для Беларусі". У сваёй рабоце ён прыводзіць факты, што сведчаць пра ўрон, нанесены вайной у вытворчай і невытворчай (скарачэнне насельніцтва, чалавечага капіталу, спыненне адукацыйнага працэсу) сферах. Моцным бокам сваёй работы лічыць тое, што яна выдатна структуравана і дае вычарпальную інфармацыю па кожнай сферы.

Цяжкасці ў працэсе даследавання выклікала адсутнасць неабходнай статыстыкі (напрыклад, не было звестак, якую долю вытворчасці склалі тыя галіны прамысловасці, што былі эвакуіраваны). Таму нярэдка даводзілася рабіць падлікі самому, але гэта пайшло толькі на карысць даследчыку.

Ігар лічыць тэму вартай вывучэння, каб зразумець усе памылкі і не паўтарыць іх зноў, таму многім сучасным кіраўнікам было б няблага азнаёміцца з гэтым вопытам.

### Досвед, карысны і сёння



**Аляксандр ЖУКАЎ, студэнт III курса эканамічнага факультэта,** выступіў на конкурсе з работай "Аднаўленне сістэмы эканамічных адносін у народнай гаспадарцы Беларусі пасля яе вызвалення (1944—50-ыя гг.)".

Першая частка — спроба прааналізаваць логіку мыслення кіраўніцтва двзюх дзяржаваў. На падставе свайго аналізу даследчык прыходзіць да высновы: логіка памылковага мыслення Германіі, заснаваная на ідэі сусветнага панавання (прыхаванага за ідэяй перавагі арыйскай нацыі), якой супрацьстаяла логіка адраджэння, развіцця і абароны СССР, была асуджана на паражэнне. Ідэя павелічэння разнастайнасці, а не яе змяншэння шляхам стандартызацыі і уніфікацыі рухае наперад чалавецтва — пра гэта сведчыць хада гісторыі.

Другая частка работы распавядае пра перавод эканомікі з ваенных на мірныя рэйкі. У пасляваенны час была наладжана сістэма планавання, даволся рэфармаваць фінансавую сістэму, асаблівую ўвагу належала надаць развіццю адукацыі і цяжкой прамысловасці.

Падчас працы Аляксандру давялося аналізаваць мноства, здавалася б, супярэчлівых крыніцаў. Тым не менш, гэты перыяд падаецца яму вартым вывучэння, бо досвед, атрыманы пры наладжванні эканамічных адносін у той перыяд, можа быць карысным пры рэфармаванні эканамічных адносін цяпер. На думку Аляксандра, сучасная эканоміка адчувае патрэбу ў пераходзе на інтэнсіўны шлях развіцця.

### Лішняя "Лінія Молатава"



**Святаслаў КУЛІНОК, студэнт III курса гістарычнага факультэта,** удзельнічаў у конкурсе з работай пад назвай "Роля ўмацаваных раёнаў "Лініі Молатава" ў абарончых баях на тэрыторыі Беларусі ўлетку 1941 г." "Лінія Молатава" — гэта мноства доўгатэрміновых фартыфікацыйных збудаванняў, якія планаваліся ўзвесці пасля вызвалення Заходняй Беларусі і зрабіць падмуркам абароны ўсёй акругі.

У сваёй рабоце (якой ён прысвяціў больш за год) Святаслаў аналізуе не толькі праблемы, звязаныя з арганізацыяй і будаўніцтвам умацаванняў, але і самі баявыя дзеянні на гэтай тэрыторыі. Для напісання работы аўтару давялося наведаць Брэсцкі і Гродзенскі ўмацаваныя раёны, дзе ён на свае вочы пабачыў доты і дзоты. Шлях даследавання быў нялёгкім: далёка не ва ўсе архівы адкрыты доступ, тым больш што абарончае будаўніцтва — таямніца за сямю пячаткамі, паколькі ёсць аб'ектам стратэгічнага прызначэння. Цяжкасці выклікала і тое, што мноства дакументаў па гэтай тэме вывезена ў Расію, у Цэнтральны архіў Міністэрства абароны.

Разважаючы над тым, якую ролю адыграла "лінія Молатава" падчас абароны, ці апраўданы былі выдаткі на яе ўзвядзенне, Святаслаў прыходзіць да высновы пра яе немэтазгоднасць. Галоўныя аргументы аўтара: па-першае, не абавязкова было ўзводзіць новую лінію (была магчымасць умацаваць "лінію Сталіна"), па-другое, фартыфікацыйныя збудаванні аказаліся не дастаткова падрыхтаванымі да баявых дзеянняў (нападаючым удалося прарваць іх без асаблівых цяжкасцей).

Праблема, якой прысвяціў сваю работу Святаслаў Кулінок, з'яўляецца не дастаткова вывучанай, таму хлопец адчувае сябе ў пэўнай ступені першаадкрывальнікам. Гэта адначасова і вельмі прыемна (ёсць запал, стымул працаваць больш і лепш), і надзвычай адказна (трэба ўзважваць кожнае слова, кожную выснову).

**Ала МАЧАЛАВА**

**Фотаздымкі Юліі ПАПОВАЙ**

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

## ЦІ ВЕДАЕЦЕ ВЫ?

*Віктарына, прысвечаная 60-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, праходзіць у БДУ. Удзел у ёй могуць узяць студэнты, магістранты, аспіранты нашага універсітэта. Апошні дзень падачы адказаў — 12 мая. Віктарына праходзіць у адзін тур.*

### Пытанні віктарыны

1. У выніку якіх наступальных аперацый Чырвонай Арміі была вызвалена тэрыторыя Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў?
2. Якія саюзныя рэспублікі СССР у гады Вялікай Айчыннай вайны былі цалкам ці часткова захоплены нямецкімі войскамі?
3. Хто з камандуючых франтамі Чырвонай Арміі загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны? Што вы ведаеце пра гэтых людзей?
4. Што такое "10 сталінскіх удараў"? Што азначаў кожны "сталінскі ўдар"?
5. Назавіце выкладчыкаў БДУ — Герояў Савецкага Саюза. На якіх факультэтах яны працавалі?
6. Назавіце самы буйны лагер смерці на тэрыторыі Беларусі. Дзе ён размяшчаўся? Колькі людзей загінула ў гэтым лагеры?
7. Што вы ведаеце пра "Локацкую рэспубліку"? Дзе яна размяшчалася?
8. Назавіце беларусаў — двойчы Герояў Савецкага Саюза. У якіх родах войскаў яны ваявалі?
9. З партызанамі якіх саюзных рэспублік ажыццяўлялі баявое ўзаемадзеянне беларускія народныя мсціўцы? Якія партызанскія атрады, брыгады і злучэнні саюзных рэспублік дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі? Назавіце іх камандзіраў.
10. Што азначае выраз "Мурамскі збор"? Што вы пра яго ведаеце?
11. Якія рэальныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны леглі ў аснову славутых савецкіх фільмаў "Шлях у "Сатурн" і "Канец "Сатурна"?
12. Назавіце першы абласны беларускі цэнтр, вызвалены Чырвонай Арміяй. Калі гэта адбылося? У выніку якой баявой аперацыі?

**Адказы трэба падаваць у закленым канверце з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку, факультэта, курса, кантактнага тэлефона ва ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю (прасп. Ф.Скарыны, 4, пакой 207, тэл. 209-50-59).**

## ВЫСТАВА НА ГІСТАРЫЧНЫМ

З нагоды 60-годдзя Перамогі ў аўдыторыі № 45 гістарычнага факультэта БДУ экспануецца выстава, прысвечаная ваенным падзеям у Беларусі, а таксама жыццю нашага універсітэта ў гэтыя час. Пра цяжкасці і пакуты тагачасных выкладчыкаў і студэнтаў сведчаць фотаздымкі і лісты. На выставу могуць патрапіць усе жадаючыя. Трэба толькі зрабіць папярэднюю заяўку дырэктару музея гістфака В.М. Сідаровічу (тэл. 227-42-44, 222-35-81). Выстава працуе да 18 мая.

**Алена КРЫЎКІНА**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

60-годдзе Вялікай Перамогі

3 мая 2005 года, № 10 (1918)

## КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

### ПАМЯЦЬ І СЛАВА

60-годдзю Перамогі прысвечана кніга "Памяць і слава: Беларускі дзяржаўны універсітэт у гады Вялікай Айчыннай вайны. 1941—1945". Выданне падрыхтавана ў серыі "Memoria et Gloria".

На старонках кнігі адлюстравана гісторыя БДУ ў перыяд Вялікай



Айчыннай вайны. На падставе гістарычных крыніц, якія захоўваюцца ў дзяржаўных архівах і музеях, успамінах ветэранаў расказваецца пра ўдзел студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў як у складзе дзеючай арміі, партызанскіх і падпольных фарміраванняў, так і на працоўным фронце.

У прадмове "Наша Перамога" рэктар В.І. Стражаў зазначыў: "Даўно зараслі акопы Другой сусветнай вайны. Але не зараслі ў душах глыбокія "ямы", "барозны" і раны, не загаіліся рубцы ў памяці людской. Сёння мы перагортваем гераічныя старонкі нашай далёкай гісторыі... Нас хвалююць успаміны пра той далёкі час, перажытыя асабіста, а таксама пачутыя ад бацькоў, дзядуляў і бабуляў. Вайна адгукаецца ў душах і сэрцах кожнага па-свойму..."

Кніга адрасуецца выкладчыкам і студэнтам, усім, хто цікавіцца слаўнымі традыцыямі БДУ. Акрамя таго, выданне атрымаюць усе ветэраны Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ**

## АБ'ЯВЫ

### РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ крымінальнага права;

ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтва;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: радыёфізікі, крымінальнага права, гісторыі Расіі, сістэмнага аналізу;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: тэлебачання і радыёвяшчання, медыка-сацыяльнай работы і медыцынскай псіхалогіі, англійскай мовы і моўнай камунікацыі, кібернетыкі;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтва, медыка-сацыяльнай работы і медыцынскай псіхалогіі, менеджменту і арганізацыі аховы здароўя, сацыялогіі, рамансктх моў;

АСІСТЭНТА КАФЕДРЫ лазернай фізікі і спектраскапіі.

**Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы. Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, БДУ, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.**

# СВЕТЛАЙ ПАМЯЦІ

## Эсэ

Далёкі і блізкі журботны ўрачыста-сонечны ўспамін. Каторы год запар, вясной, як толькі зазіхаціць сонца, у маі можна было ўбачыць, як адзінокая, прыбітая горам жанчына цяжкай няроўнай хадою прыходзіла сюды, у скверык ва універсітэцкім двары. Прыладжвалася на краёчак і падоўгу сядзела на лавачцы, пазіраючы, як уваходзяць у дзверы ці выходзяць з будынка БДУ студэнты. Яна, здавалася, разгойдвалася ўсім целам у такт хадзе юнакоў і дзяўчат, позіркам лавіла любыя іх рухі, а сэрца яе ўздрыгвала і пачынала яшчэ мацней тахкаць пры кожным стуку ўваходных дзвярэй. З нейкай асаблівай зацікаўленасцю, спачувальна (гэта лёгка можна было заўважыць) услухоўвалася яна ў размовы студэнтаў — вось-вось, здавалася, гатовая і сама ўступіць у гутарку, не раз наважваючыся перапытаць альбо спыніць гарачыя спрэчкі, астудзіць, ці паўшчуваць, ці парадавацца, але так і сядзела, змаўчаўшы; ды замест таго, каб асекчы, часам, маладых, падоўгу любавалася імі, а ад таго нібыта заглядвала ў тварыкі. Жанчына пазнавала і не пазнавала маладых хлопцаў і дзяўчат. Кожны з тых хлопцаў-студэнтаў быў падобны на яе сына. Яны ўсе былі ў такім узросце, як і яе адзіная надзея-апірышча. Ва універсітэце яе ведалі, віталіся, нават заклікалі пагрэцца на другі паверх новага галоўнага корпуса, не аднойчы прапаноўваючы філіжанку гарачай гарбаткі з заваркай з травак — руты-мяты, маліны, ліпавай, вішнёвай, чабарковай. Жанчына адмаўлялася шторaз ад пачастунку, хуценька і мітусліва пакідала дворык, каб назаўтра ці праз дзень зноўку з'явіцца тут, пабыць незаўважнай, паназіраць за цяперашнімі студэнтамі, паўспамінаць, пагараваць ды; усцешанай душэўна, вярнуцца назад да сябе ў адзінокую кватэру. Не адзін студэнт азірнуўся: маці глядзела ім услед.

— Хімік ён быў, — прызналася неяк жанчына ў хвіліну шчырасці і паспавядалася. — Сын мой. Толькі паступіў вучыцца ў БДУ, а тут вайна пачалася, усяго год і правучыўся.

Жанчына не хацела ўспамінаць пра вайну. У гутарцы яна ўсё больш і больш гаварыла пра адно — пра сына, пра яго ную вучобу ва універсітэце, пра сяброў.

— Пасля першай сесіі яны ўсе ў маёй хаце гасцявалі, любіла я сынавых сяброў і сяброўак з групы: інтэлігентныя, абыходлівыя, клапатлівыя, уважлівыя. Вучыліся ахвотна, старанныя, унурыстыя.

Напэўна, ніхто з тых, хто слухаў тыя спавядальныя словы, так і не адважваўся запытаць, што сталася з сынам, бо і тады ўжо людзі добра навучыліся разумець чалавечае гора: вайна яшчэ не так даўно скончылася. І хоць многае ажывала, балючай стрэмкай сядзела ў памяці, але пра жахлівыя дні вайны нікому не хацелася ўспамінаць, а гаворкі вяліся найбольш пра жыццё.

Жанчына распавядала:

— Загінуў мой сын на флоце. Невядома дзе і магіла. Вайна забрала. Дык я штодня, як дзеці бягуць на вучобу, прыходжу сюды, а мо дзе і майго сыночка тварык мільгане, а мо хто падобны да яго — ён быў дакладна такі ж, як яны: і рост, і голас, і выхілка. Збягае з лесвіцы кумельгам, дома ў дзвярах адразу не пераступае ў хату, а стане на парог, каб вышэйшым здавацца (мы тады ў драўлянай хаціне мясціліся), а ўжо вечарамі забавіцца мог часта, я нават пабойвалася, каб не ажаніўся адразу, як школу скончыў, тады ж не да вучобы будзе: гуляй, дзяціна, — твая гадзіна.

Маці, як і сын, любіла БДУ.

Менавіта ў тыя светлыя памятныя сонечныя дні перадмайскіх шчыраванняў і вырашылі студэнты, выкладчыкі, прафесары, супрацоўнікі БДУ ўстанавіць помнік загінуўшым на той, самай крывавай і ненажэрнай вайне апошніх гадоў, увекавечыць памяць тых, "што ад роднага універсітэта пайшлі на свяшчэнную бітву з фашызмам і смерцю герояў палеглі ў змаганні, каб вечна свяціла над нашай Радзімаю сонца свабоды".

Сёння ўжо немагчыма і прыпомніць, каму належала сама ідэя ўстанавіць мемарыяльны знак, хто стаў ініцыятарам стварэння помніка, хто — скульптар, архітэктар, як ствараліся і зацвярджаліся эскізы...

> *Светлай памяці тых, што ад роднага універсітэта пайшлі на свяшчэнную бітву з фашызмам і смерцю герояў палеглі ў змаганні, каб вечна свяціла над нашай Радзімаю сонца свабоды*

Усе мы былі тады маладымі, апантанымі, няўрымслівымі, і ўсім хацелася як мага лепш і ад душы, з чыстымі памкненнямі, сардэчна ўвекавечыць подзвіг студэнтаў, жывых і мёртвых, выкладчыкаў і супрацоўнікаў, зрабіць справу, вартую флагмана вышэйшай школы — Беларускага дзяржаўнага універсітэта, прабацькі ўсіх навучальных устаноў на прасторах любай і дарагой беларускай зямелькі.

Сродкі на помнік збіралі ўсе ў БДУ. Студэнцкія будаўнічыя атрады пералічвалі свой заробак не аднаго дня на ўзвядзенне памятнага знака-сімвала. Самі студэнты працавалі па чарзе на будаўніцтве: рыхтавалі пляцоўку, залівалі фундамент, укладвалі плітку — доўгую дарожку, каб, як у царкве, віднеўся велічны пераход. Памятаюцца нашыя гарачыя пераконванні архітэктараў: трэба, маўляў, каб у сэрцы зашчымела, пакуль ідзеш! Як у саборы!

Неслі грошы і прафесары, і вахцёры, і самі студэнты.

— Вазьміце ўсе мае зберажэнні,



— ці не першай папрасіла маці-пенсіянерка таго студэнта-хіміка, што загінуў на Балтыцы. — Буду я ведаць, дзе магілка майго сына. Захачу прыйсці — прыйду, кветачкі пакладу, нібыта пагавару з крывіначкай. Няма ў мяне нікога, ён адзіны, як вока ў ілбе, і сама я — як той каласок у полі пад ветрам.

Але ці ж лёгка тады было збіраць сродкі?.. Па тым часе і падрахунак нельга адкрыць, і накапляльны фонд, кажучы па-сучаснаму, немагчыма заснаваць. Разлікі, матэрыялы, перавозкі, праца людская, аплата спецыялістаў — усё, мякка кажучы, ператваралася ў праблемы сусветнага маштабу. Але людзі як людзі, аўра ў БДУ творчая з першых дзён. Таму і справа пасоўвалася з агеньком — смела, праўдзіва ды ганарова.

Назнарок апусцім імёны, пасады, званні, а падзяка ад кожнага працаўніка і студэнта БДУ і так "прасвечваецца" на сонейку ў тым помніку за шчаслівы наш дзень — і ветэранам, і настаўнікам, і вучням, і вучоным, і студэнтам, і лаўрэатам, і героям, і радавым, і мёртвым, і жывым.

Помнік у двары БДУ адкрывалі ўрачыста 9 мая 1975 года — да 30-годдзя Перамогі. Ва універсітэцкім гарадку сабраўся ледзь не ўвесь тады шматтысячны калектыў, зіхотка-прамяністае мора. Дворык як вулей. Студэнцтва — вокам не абняць. І раннія над імі зоры — вочы Бога. Май — цвіценне мая. Цішыня.

Стаяў яркі сонечны дзень. Над карпусамі раскаціста, молада і бадзёра несліся словы клятвы моладзі на вернасць пакаленню, якое выстаяла, перамагло ў ваенным ліхалецці, словы прысягі захоўваць традыцыі старэйшых, праз гады берагчы і прымнажаць універсітэцкую славу. Слухайце, любыя, — чуеце? — сынава наша прызнанне... Прыміце ў свае абдымкі ўсё, героі-ветэраны: непераможны час, жыццё святое, студэнта, што вучыць — розум тоўчыць.

...Сонца ярка і весела кожную раніцу ў светлыя майскія дні асвятляе спачатку карпусы з універсітэцкімі аўдыторыямі, лабараторыямі, бібліятэкамі. Ды раптам зазіхаціць значок выпускніка БДУ, нібы рассечаны напалам у расселіне контурамі баявой вінтоўкі, з якой пайшлі на фронт універсітэтчыкі і не вярнуліся, каб штораніцы звінеў званок на лекцыі, каб геніі свайго народа не шукалі далёка за межамі роднага краю свае універсітэты, каб вечна зіхацела ды шчыравала над нашай дарагой Радзімай высокае сонца свабоды.

Кветкі каля абеліска.

Яны не знікаюць ніколі. Мемарыяльны знак, сімвал пачатай, але не завершанай вышэйшай адукацыі, перапынена суровай вайной, роўна як і брукаванка — адпаліраваныя за доўгія гады нястомнай хадой часу і ўдзячнымі пілігрымамі тыя чорныя камяні, здавалася, ужо самі напоўнены высокім духоўным набыткам, незабыўнай саборнай памяццю новых і новых пакаленняў, вернасцю абавязку перад героямі. Універсітэцкімі героямі.

Устае і ярка свеціць над БДУ веснавое сонца Перамогі.

Так сёння.

І так вечна.

**Уладзімір НАВУМОВІЧ**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года

3 мая 2005 года
Падпісана да друку 02.05.2005 г.
Зак. 396. Тыраж 1000 экз. Ум. друк. арк. 1
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Адрас рэдакцыі: 220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45, e-mail: Gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by